Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Бібліятэка-філіял № 5

## Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны прысвячаецца

# Міцін Іван Іванавіч (1917-1991)




Гродна
2024

**Дзяржаўная ўстанова культуры**
**«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»**
**Бібліятэка-філіял № 5**

**ВЕТЭРАНАМ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ**
**ВАЙНЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА**

# МІЦІН ІВАН ІВАНАВІЧ
# (1917-1991)

біябібліяграфічны спіс

ГРОДНА, 2024

ББК 63.3 (4Беі-4Гро)я2
М 70

Складальнік: Г.П. Шарэнда

**Міцін Іван Іванавіч (1917-1991): біябібліяграфічны спіс / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»; бібліятэка-філіял № 5; складальнік Г. П. Шарэнда. – Гродна, 2024. – 19 с. – (Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны прысвячаецца).**

Выданне прысвечана ветэрану Вялікай Айчыннай вайны, начальніку разведкі артылерыйскага дывізіёна, журналісту, пісьменніку, мастаку і музыканту. Ваяваў у складзе 3-га Беларускага фронту, вызваляў Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I-й ступені і 10-цю медалямі.

Бібліяграфічны спіс будзе цікавы краязнаўцам, гісторыкам, студэнтам гістарычных факультэтаў, супрацоўнікам сферы адукацыі і культуры, экскурсаводам, блогерам і ўсім тым, хто цікавіцца тэмай Вялікай Айчыннай вайны і краязнаўствам.

Чытацкае прызначанне: 12+

**МІЦІН ІВАН ІВАНАВІЧ**
**(1917-1991)**




**Начальнік разведкі артылерыйскага дывізіёна, журналіст, пісьменнік, мастак і музыкант.**

**Ваяваў у складзе 3-га Беларускага фронту, вызваляў Беларусь.**

**Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені, 10-цю медалямі («За ўзяцце Кёнінгсберга», «За Перамогу над Германіяй» і інш.).**

Міцін Іван Іванавіч нарадзіўся 19 верасня 1917 года ў Пскоўскай вобласці Пскоўскага раёна ў вёсцы «Востраў імя Заліта». Бацькі зямлі сваёй не мелі, паколькі вёска месцілася на востраве на Пскоўскім возеры, дзе адзіным сродкам існавання многіх жыхароў было рыбалоўства.

Бацька, Іван Васільевіч Міцін, лічыўся мешчанінам. Маці, Ірына Васільеўна, была хатняй гаспадыняй, паколькі сям’я была вялікай.

У 1919 годзе, калі Івану было 2 гады, маці памерла ад чорнай воспы, пакінушы на руках бацькі шасцёра дзяцей.

У 1921 годзе Іван Васільевіч ажаніўся другі раз. Мачыха Марфа Якіманаўна зрабіла спробу замяніць маці, але, калі з’явіліся свае дзеці, пераключылася на іх.

У 1924 годзе Іван Міцін пайшоў у вясковую школу. Вучыўся так: у першым класе – адзін год, у 2 класе – два гады, у 3 класе – адзін год. У 4 класе вучыўся ў сваёй вёсцы толькі да лютага месяца, потым, у сувязі з пераездам бацькі на новую працу, у Ленінградзе.

Сям’я стала жыць на станцыі Кінерына, што 75-ці км ад Ленінграда.

Як потым напіша сам Іван Іванавіч у сваіх успамінах: “Бацька з таго часу перастаў жыць з сям’ёй, сям’я пачала распадацца. Я, не вытрымаўшы ціску і біцця з боку мачыхі, сышоў з сям’і. Мне тады было 11 гадоў…”


Автобиография.

**Сшытак з аўтабіяграфіяй Міціна І.І.**

У сакавіку 1929 года маленькі Іван наняўся пастушком да селяніна Апосава ў вёсцы Ліпавая гара Валасоўскага раёна Ленінградскай вобласці.

У тым жа годзе восенню вярнуўся назад у сям’ю і працягнуў вучобу ў 4

класе пасялковай школы. У красавіку 1930 года ў сувязі з цяжкім фінансавым становішчам кінуў школу і пайшоў зноў у пастушкі.

Вясной 1933 года бацька запрасіў Івана да сябе ў Ленінград, паабяцаўшы ўладкаваць у школу, каб той змог атрымаць спецыяльнасць.

З успамінаў Міціна І. І.: "Прыехаўшы да бацькі ў пачатку траўня 1933 года, я ўбачыў, што ў яго жывуць трое дзяцей ад другога шлюбу, дакладней, ад маёй мачыхі. Набора ў школу ФЗН (фабрычна-завадскога навучання) не было, і бацька пасылаў мяне жабраваць. Гэта было не ў маім характары, я пазнаёміўся ў Ленінградзе з такімі ж жабракамі, як і я, і сышоў ад быцькі…"

У чэрвені 1933 года яго затрымалі супрацоўнікі міліцыі і адправілі ў дзіцячы ізалятар, адкуль у лістападзе 1933 года перавялі у школу для непаўналетніх правапарушальнікаў у горадзе Дзіцячае Сяло (зараз г. Пушкін), што ў 25-ці км ад Ленінграда.

У 1935 годзе Іван Міцін скончыў навучанне і атрымаў спецыяльнасць слесара 4-га разрада. Паехаў да сваёй сястры, якая жыла на станцыі Чудава Кастрычніцкай чыгункі Ленінградскай вобласці. Там Івана Іванавіча прынялі на работу слесарам на Чудаўскі цагляны завод.

У лістападзе 1940 года Івана Іванавіча Міціна прызвалі на службу ў Чырвоную Армію. Яго залічылі ў вучэбную батарэю, дзе рыхтавалі малодшых камандзіраў гармат у горад Молатаў Уральскай Вайсковай Акругі. Скончыць навучанне Іван не паспеў – пачалася Вялікая Айчынная вайна.

## Абараняючы Радзіму

Ужо ў верасні 1941 года ў складзе 545 ПАП РГК Іван Іванавіч прымаў удзел у баях пад станцыяй Андрэапаль, у абароне горада Ржэў. Да сакавіка 1942 года быў наводчыкам гармат. У тым жа 1942 годзе за гераізм Міцін Іван Іванавіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

З сакавіка 1942 года Іван Іванавіч стаў камандзірам зброі, у пачатку красавіка – ужо камандзірам агнявога ўзвода ў званні яфрэйтара, з сярэдзіны красавіка Міціну было прысвоена званне – сяржант, праз месяц малодшы сяржант.

У баях пад горадам Ржэвам, якія пачаліся ў канцы чэрвеня 1942 года, Міцін І. І. быў паранены ў правую нагу, але праз сем дзён вярнуўся ў свой агнявы ўзвод.

У лютым 1943 года Івану Іванавічу было прысвоена званне – лейтэнант, у жніўні 1943 года – старэйшы лейтэнант. У тым жа 1943 годзе Міціна перавялі з агнявога ўзвода на пасаду начальніка разведкі дывізіёна.

У лістападзе 1943 года ў баях пад горадам Віцебскам Іван Іванавіч быў паранены. За ўдзел у гэтых баях камандаваннем 39 Арміі Калінінскага фронта быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (прыказ № 035/п 30.10.1943 г.).

545 ГАП (Гарматны артылерыйскі полк) у маі 1944 года, дзе ваяваў Міцін І. І., быў аб’яднаны з іншым палком гэтай жа сістэмы і атрымаў назву 139 АП (артылерыйскі полк) брыгады і ўвайшоў у склад 39 Арміі 3-га Беларускага фронту.

Разам са сваёй часткай Міцін І. І. перашоў межы Усходняй Прусіі ў кастрычніку 1944 года. У студзені 1945 года ў ходзе наступа частка падышла да сцен Кёнігсберга. У пачатку красавіка 1945 года прымаў удзел у штурме і ўзяцці Кёнігсберга, як камандзір батарэі.

13 красавіка 1945 года ў баях на Земландскім (Калінінградскім) паўвостраве быў цяжка паранены ў галаву і накіраваны ў шпіталь.

## Працоўныя будні

У сярэдзіне траўня 1945 года, пасля выпіскі са шпіталя, Іван Іванавіч быў накіраваны штабам 3-га Беларускага фронту ў 10 артылерыйскую дывізію на пасаду начальніка разведкі дывізіёна.



4 ліпеня 1945 года Міціна І. І. накіравалі для аховы маёмасці часткі, якая знаходзілася ў раёне горада Скідзель.

Менавіта ў гэты перыяд у Скідзелі Іван Міцін пазнаёміўся Кацярынай Іванаўнай Шмідт. Ужо ў жніўні 1945 года яны пабраліся шлюбам.

Іван Іванавіч праслужыў тут да 17 кастрычніка 1945 года і быў прызваны ў іншую частку, што знаходзілася ў горадзе Старые Дарогі Бабруйскага раёна.

У сакавіку 1946 года быў дэмабілізаваны з радоў Савецкай Арміі на падставе прыказа Баранавічцкай ваеннай акругі № 0105 ад 19.02.1946 г. і вярнуўся ў горад Скідзель да жонкі. У горадзе пайшоў на працу ў сістэму народнай адукацыі на пасаду настаўніка фізічнай падрыхтоўкі ў Губінскую сярэднюю школу.

У жніўні 1947 года Міцін І. І. прыказам РайАНА быў



пераведзены на работу ў Скідзельскую сярэднюю школу № 1 (зараз ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Скідзель імя В.Р. Пешко») на пасаду настаўніка ваеннай падрыхтоўкі, пазней выкладаў прадметы «маляванне» і «чарчэнне».

У 1961 годзе паступіў завочна ў Калінінградскі універсітэт.

У 1964-65 гг. працаваў дырэктарам дзіцячага дома ў вёсцы Вялікае Мажэйкава.

Пасля дзіцячага дома працаваў старшым выхавацелем у Ражанскай школе-інтэрнаце.

Паралельна вучыўся ў Гродзенскім педагагічным інстытуце (зараз Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы), які скончыў у 1972 годзе і атрымаў спецыяльнасць “настаўнік рускай мовы і літаратуры”.

У 1978 годзе пайшоў на пенсію і пачаў пісаць кнігі пра Вялікую Айчынную вайну “Листая страницы памяти” (“Гартаючы старонкі памяці”).

## Успаміны пра Івана Іванавіча Міціна

**Юлія Чамярыс, унучка Міціна І. І.:**



“Мы з дзядуляй вельмі сябравалі і праводзілі шмат часу разам, гэта вельмі яркія ўспаміны майго дзяцінства, хоць дзядулі не стала, калі мне было толькі шэсць гадоў…”

Дзядуля навучыў мяне граць на электрабаяне і на адной струне гітары, а калі ён акампанаваў на акардэоне, мы разам спявалі ваенныя песні. Аднойчы я прынесла дзядулі свае “каракулі” і сказала надрукаваць на машынцы і маю кнігу. Ён адклаў працу і зрабіў мне кнігу з вершамі пра маю сям’ю і пра мяне:



***Рассказ***
***про маму и папу,***
***бабушку и дедушку,***
***Дядю Ваню и тётю Люду,***
***про всех остальных.***
***И, конечно, про Юленьку***

*Ходит мама на работу,*
*Там садится у стола –*
*У неё своя забота,*
*У неё свои дела.*

*Папа мой в Афганистане,*
*Он в машине за рулём*
*Он в дороге не устанет –*
*Я ведь думаю о нём.*
*Не боится он душманов –*
*Автомат всегда при нём.*
*Вы не суйтесь, басурманы!*
*Папа встретит вас огнём!*

*Варит бабушка картошку*
*Вкусную горячую,*
*Я покушаю немножко,*
*И совсем не плачу я.*
*А мой дедушка – я знаю,*
*Пишет книжку для меня,*
*Подрасту и прочитаю*
*Про него и про себя.*

*Дядя Ваня за границей*
*С тётей Людою живут,*
*Там же брат мой и сестричка –*
*Я их в гости очень жду!*

*Как приедут в отпуск летом –*
*Пусть счастливым будет путь–*
*Привезут они конфеток*
*И ещё чего-нибудь.*

*На гитаре я играю,*
*То танцую, то пою,*

*То в коляске покачаю*
*Куклу-Машеньку свою.*
*Смастерю себе машину*
*То возьму велосипед,*
*То играю в магазины,*

*То варю для всех обед.*
*Накормлю я кукол кашей,*
*Уложу всех спать в кровать,*
*А потом в квартире нашей*
*Принимаюсь убирать.*
*Маму я с работы встречу,*
*Побегу я к ней навстречу,*
*Обниму и поцелую*
*Маму милую свою!*

*Нет минуточки свободной,*
*Чтобы книжку почитать,*
*Я прошу об этом маму*
*И укладываюсь спать.*
*Ведь назавтра всё сначала*
*Надо будет начинать!*

Дзядуля сядзеў за друкаванай машынкай цэлымі днямі, а калі-нікалі і начамі. Такім я яго і запомніла. І я марыла, каб рукапіс быў выдадзены. Каб у кожнага з дзяцей і ўнукаў

дзядулі на паліцы стаяла яго кніга! Пакуль мы помнім пра сваіх памерлых родных, яны жывуць у нашых сэрцах. Дзякуючы гэтай кнізе Іван Іванавіч будзе жыць і ў сэрцах сваіх нашчадкаў, з якімі яму не давялося пазнаёміцца асабіста…”

**Наталля Даніловіч, малодшая дачка Міціна І. І.:**

“Бацька быў майстра на ўсе рукі. Ён будаваў дом, заўсёды штосьці рамантаваў, рабіў мэблю, займаўся садам, цудоўна іграў на акардэоне і гітары, пеў песні, добра маляваў і займаўся фотаздымкай.



Але перш за ўсё я запомніла яго як таленавітага настаўніка рускай мовы і літаратуры. Яго ўрокі былі вельмі цікавымі. Калі я вучылася ў 10 класе, бацька прыйшоў да нас на ўрок літаратуры і сказаў: “Добры дзень, дзеці! Добры дзень, дачка! Я прыходжу даддому – ты ўжо спіш, я сыхожу раніцай – ты яшчэ спіш. Хоць на ўруку пабачымся!”

Гэта была праўда, бацька заўсёды шмат працаваў.

Урокі рускай мовы і літаратуры, якія вёў бацька, заўсёды былі цікавымі, незвычайнымі і вельмі запамінальнымі…

Бацька пісаў вершы і песні, часта друкаваўся ў газетах і часопісах. Яго творы вылучаліся маляўнічым тэкстам, глыбокім сэнсам і прыгожай літаратурнай мовай…”

**Міцін Іван Іваавіч, сын Міціна І. І.**:

“Бацька не любіў гаварыць пра вайну… Толькі



кавалачкі ўспамінаў тых цяжкіх чатырох гадоў мне атрымалася падслухаць, калі да нас прыязджалі ў госці яго сябры-аднапалчане.

Выпадкова падслуханыя размовы будзілі маё дзіцячае ўяўленне, і я хацеў быць такім смелым, як бацька.

Для мяне ён быў герой!

Гэта паўплываа на мой выбар прафесіі – я стаў вайскоўцам. Прафесійна абараняць Радзіму вырашыў і мой сын, таксама Іван Іванавіч”.

**Сяргей Ступакевіч унук Міціна І. І.**:



“Для мяне дзядуля быў прыкладам для пераймання і несумнеўным аўтарытэтам. Ён умеў рабіць усё, і ўся праца ў яго руках атрымлівалася добра. Дзядуля прыгожа размаўляў на літаратурнай мове, быў вельмі разумным, начытаным і годна паводзіў сябе ў любой сітуацыі. У яго доме вельмі часта былі госці, і дзядуля граў на акардэоне ці гітары песні ваенных гадоў.

Разам мы займаліся living рознымі «мужчынскімі» справамі: калолі дровы, што-небудзь майстравалі па гаспадарцы, рабілі фотаздымкі. Калі я пайшоў служыць на ваена-марскі флот і прыехаў у адпачынак у форме мічмана, дзядуля сказаў, што ганарыцца мной. Для яго прафесі абаронцы сваёй Радзімы была самай ганаровай.

Я заўсёды хацеў быць такім, як мой дзед і да гэтага часу прытрымліваюся яго адносін да жыцця».

## ФОТАГАЛЕРЭЯ



**з унукам**
**Сяргеем Ступакевічам**



**Выступ на адной з урачыстацей**


Хорошо поется с дедушкой.

Фото В. ГОФМАНА.

ГОНОРАР ЭТОГО НОМЕРА РЕДАК
№ 707 СОВЕТСКОГО ДЕТСКОГО ФО
ИНТЕРНАТУ ДЛЯ СИРОТ, НАД КОТО
РЕТ ШЕФСТВО.

3 июля 1988 года «СЕЛЬС

**з унучкай Юліяй Чамярыс**
**падчас выступлення на свяце**
**Дзень Перамогі ў г. Скідзель**



**Міцін Іван Іванавіч са сваімі ўзнагародамі.
Асабліва ганарыўся трыма медалямі:
за ўзяцце Кёнігсберга,
За перамогу над Германіяй і
За адвагу.**



**Міцін Іван Іванавіч у 1944 г. падчас
Вялікай Айчыннай вайны**

# БІБЛІЯГРАФІЯ

## ЛІТАРАТУРА АБ ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ

Григорьев, А. Огневые версты войны [О творчестве И.И. Митина] / А. Григорьев // Сельская новь. – 1988. – 1 сент. – С. 3.

Иван Иванович и Екатерина Ивановна Митины // Голоса детей войны : посвящается 75-летию Великой Победы и 80-летию образования Гродненского района / [составители: Л.В. Кашенкова, Л.В. Юргель, Д.С. Якубович; Гродненская районная женская организация «Надежда» [и др.]. – Гродно : ЮрСаПринт, 2021. – С. 326-328.

## ВІДЭАРЭСУРСЫ

Бодрое утро. Великая Отечественная война в истории моей семьи. Юлия Чемерис [Видеозапись] // Гродненская телерадиокомпания. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=B2LxSfFlhV4. – Дата доступа: 28.05.2024.

Издание книги по рукописи участника Великой Отечественной войны Ивана Митина [Видеозапись] // Гродненская телерадиокомпания. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=Zbx4PHkSDzc. – Дата доступа: 28.05.2024.

**ВЕТЭРАНАМ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА**

# МІЦІН ІВАН ІВАНАВІЧ (1917-1991)

біябібліяграфічны спіс

Складальнік
Ганна Паўлаўна Шарэнда

Рэдактар
Ілюшына І.М.